**Даўгач Т.В.**

## ІНФАРМАЦЫЙНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ КРЫНІЦ ПА ГІСТОРЫІ СІСТЭМЫ КІРАВАННЯ ВЁСКАЙ БЕЛАРУСКА-ЛІТОЎСКІХ ГУБЕРНЯЎ ПАСЛЯ АГРАРНАЙ РЭФОРМЫ 1861 Г.

Адмена прыгоннага права стала важнай падзеяй у развіцці капіталістычных адносін у беларуска-літоўскіх губернях. Аграрная рэформа пацягнула за сабой карэнныя змены ва ўсіх сферах грамадскага і эканамічнага жыцця. Паколькі рэформа 1861 г. стала першай з шэрагу буржуазных пераўтварэнняў XIX ст. у Расійскай імперыі, менавіта яна пацягнула за сабой найбольш глабальныя наступствы, якія ўвасобіліся ў стварэнні прынцыпова новай сістэмы кіравання вёскай, якая была прадстаўлена як органамі сялянскага самакіравання – сялянскай грамадой і валасным праўленнем на чале з валасным старшынёй, так і мясцовай адміністрацыяй на ўзроўні павета і губерніі – павятовымі з’ездамі міравых пасрэднікаў (замененымі у 1878 г. у Віцебскай, Мінскай і Магілёўскай губернях павятовымі па сялянскіх справах прысутнасцямі) і губернскімі па сялянскіх справах прысутнасцямі, якія па ўказу Аляксандра III ад 12 ліпеня 1889 г. «О преобразовании местных крестьянских учреждений и судебной части в Империи» у пачатку XX ст. былі пераўтвораны ў губернскія прысутнасці [1, с. 104–107].

Спецыфіка прадмета даследавання прадугледжвае выкарыстанне толькі пісьмовых крыніц, сярод якіх варта вылучыць некалькі груп:

а) заканадаўчыя дакументы;
б) матэрыялы справаводства;
в) актавыя матэрыялы;
г) эга-дакументы;
д) публіцыстыка.

Да групы ***заканадаўчых дакументаў*** адносяцца маніфесты, палажэнні, указы, рэскрыпты, інструкцыі і ўласна законы. Найважнейшымі крыніцамі, ў якіх сканцэнтраваны звесткі аб механізме фарміравання новай сістэмы кіравання вёскай і паўнамоцтвах чынавенства, з'яўляюцца «Общее положение о крестьянах, вышедших из крепостной зависиомсти» [10] і «Положение о губернских и уездных по крестьянским делам учреждениях» [12]. Спецыфічныя паўнамоцтвы сельскай адміністрацыі беларуска-літоўскіх губерняў акрэслены таксама ў мясцовых Палажэннях. Гэта «Местное положение о поземельном устройстве крестьян, водворенных на помещичьих землях в губерниях: великороссийских, новороссийских и белорусских» и «Местном положении о поземельном устройстве крестьян, водворенных на помещичьих землях, в губерниях: Виленской, Гродненской, Ковенской, Минской и части Витебской» [4; 5]. Дакументы гэтай групы даюць уяўленне аб працэсе фарміравання новай сістэмы кіравання вёскай, функцыях і паўнамоцтвах яе структурных элементаў, заканадаўчай палітыцы ўрада адносна аграрнага пытання.

Механізм практычнай рэалізацыі заканадаўства на месцах найбольш поўна прасочваецца праз аналіз дакументальных калекцый мясцовых архіваў. Выяўленыя ў іх дакументы склалі самую масавую групу даследаваных тэматычных крыніц – ***матэрыялаў справаводства***. Матэрыялы дадзенай групы розняцца як па форме, так і па змесце, што надае магчымасць вылучыць сярод іх некалькі падгруп: 1) арганізацыйна-распарадчая дакументацыя; 2) справаздачная дакументацыя; 3) дзелавая перапіска; 4) пратаколы і журналы пасяджэнняў установ па сялянскіх справах.

Да падгрупы *арганізацыйна-распарадчай дакументацыі* адносяцца цыркуляры, распараджэні, прадпісанні, аб’явы, даручэнні і інструкцыі ўзроўню Міністэрства ўнутраных спраў, генерал-губернатарства, губернскага і павятовага кіраўніцтва. Крыніцы гэтай падгрупы робяць відавочнымі адрозненні ў функцыянаванні органаў кіравання вёскай беларуска-літоўскіх губерняў ад такіх жа ўстаноў у іншых рэгіёнах Расійскай імперыі, а таксама даюць магчымасць высветліць, як “укладвалася” агульнаімперскае заканадаўства на глебу мясцовых сацыяльна-эканамічных асаблівасцей. Дадзеныя дакументы таксама дазваляюць вызначыць механізмы рэагавання органамі кіравання сялянамі на цяжкасці, якія ўзнікалі ў ходзе рэалізацыі рэформы.

*Справаздачныя дакументы* змяшчаюць у сабе аналітычныя заключэнні справаздачнай асобы аб стане той ці іншай справы, а таксама статыстычна-ўліковыя звесткі ў выглядзе дадаткаў (спісаў і табліц). Аднымі з найбольш інфарматыўных крыніц па дадзенай праблематыцы



Репозиторий ВГУ

з’яўляюцца справаздачы міравых пасрэднікаў і паверачных камісій, штогадовыя справаздачы губернскіх па сялянскіх справах прысутнасцей міністру ўнутраных спраў [напр. 7, арк. 38–44]. Дакументы гэтай падгрупы ўтрымліваюць інфармацыю аб асабістым складзе ўстаноў па сялянскіх справах; дзейнасці валасных праўленняў; міравых пасрэднікаў; міравых павятовых з'ездаў, пераўтвораных пасля ў павятовыя па сялянскіх справах прысутнасці, а таксама аб становішчы ў вёсцы ў цэлым. Яны дазваляюць прааналізаваць кадравы склад устаноў па сялянскіх справах, прасачыць яго змены ў ходзе і пасля паўстання 1863–1864 гг., а таксама зрабіць выснову аб якасных зменах функцыянавання вёскі, якія рушылі за дадзенымі пераўтварэннямі. Улічваюцы перыядычны характар справаздач, іх аналіз дае магчымасць адлюстраваць працэс і выніковасць дзейнасці мясцовых устаноў на пэўным этапе іх працы.

*Дзелавая перапіска* – асобная падгрупа дакументаў, да якой адносяцца паведамленні, афіцыйныя пісьмы, адносіны, рапарты, данясенні, запыты, прадстаўленні, прашэнні і скаргі адных устаноў на другія. Цікавасць да дадзеных дакументаў абумоўлена магчымасцю на іх аснове прасачыць узаемаадносіны і сістэму парпарадкавання ўстаноў, а таксама выявіць сітуатыўныя віды дзейнасці, якія не былі рэгламентаваны заканадаўствам, але мусілі быць выкананымі. Падобным інфармацыйным патэнцыялам валодаюць *журналы і пратаколы пасяджэнняў мясцовых устаноў* [напр: 8]. Дадзеная падгрупа дакументаў утрымлівае ў сабе звесткі аб ходзе абмеркавання праблем на ўзроўні мясцовых улад, працэдуры прымання рашэнняў ва ўстановах па сялянскіх справах, а таму дазваляе выявіць і прааналізаваць цяжкасці, з якімі даводзілася сутыкацца “на месцах” у практычнай рэалізацыі аграрнага заканадаўства Расійскай імперыі на тэрыторыі Беларусі.

Дзейнасць па рэалізацыі сялянскай рэформы зафіксавана ў шматлікіх ***актавых крыніцах*** – устаўных граматах, выкупных актах. Менавіта дадзеныя дакументы вызначалі жыццё пярэфарменнай вёскі беларуска-літоўскіх губерняў. Устаўныя граматы фіксавалі канкрэтныя ўмовы выхада сялян з залежнасці, а таму кожная грамата ўтрымлівае інфармацыю аб зямельным складзе маёнтка, у якім яна была складзена (сенажаці, сядзібныя землі, якія знаходзяцца ў падворным і абшчынным карыстанні, выганы, нязручныя зямлі); пра насельніцтва, якое пражывала на землях маёнтка (паказвалася колькасць чалавек, якія пражывалі ў маёнтку, іх прыналежнасць да сацыяльных груп); інфармацыя аб сельскіх грамадах, селішчах і гаспадарах сялянскіх двароў. Дадзеныя дакументы дазваляюць прасачыць працэдуру размежавання памешчыцкіх і сялянскіх зямель, якія прызначаліся для выкупу. Выкупны акт адлюстроўваў фінансавы бок устаўной граматы і фіксаваў памеры выкупных сум. Да дадзеных актавых крыніц дадаваліся пратаколы міравых пасрэднікаў, прыгаворы сельскага сходу, скаргі сялян і пастановы губернскіх па сялянскіх справах прысутнасцей, што дае магчымасць на іх базе прасачыць усю працэдуру заключэння дамовы аб выкупе зямлі сялянамі. Акрамя гэтага, дакументы дадзенай падгрупы даюць уяўленне пра ўзаемаадносіны органаў кіравання вёскай з сялянамі, памешчыкамі, міравымі пасрэднікамі, сельскай адміністрацыяй.

На сучасным этапе развіцця гістарычнай навукі і пераасэнсавання ролі і месца чалавека ў гістарычным працэсе вялікую цікавасць прадстаўляюць ***эга-дакументы.*** Негледзячы на суб’ектыўны характар дадзенай групы крыніц, яны ўтрымліваюць унікальную інфармацыю па гісторыі штодзённасці, аб індывідуальнай памяці і поглядах на розныя сацыяльныя з’явы. Крытэрам, які вызначае аднясенне дакумента да гэтай групы крыніц, з’яўляецца наяўнасць так званай “Я-канструкцыі” – катэгорыі, якая дазваляе з той ці іншай ступенню верагоднасці даведацца аб светапоглядзе, успрыманні рэчаіснасці, жыццёвым досведзе і эмацыянальным стане асобы-стваральніка дакумента. У межах даследавання сацыяльна-эканамічнай праблематыкі гісторыі Беларусі ў азначаны перыяд да дадзенай групы былі аднесены мемуары, эпісталярыі, успаміны ўдзельнікаў падзей, скаргі і прашэнні.

Вялікую цікавасць прадстаўляюць успаміны тых міравых пасрэднікаў, якія былі дасланы ў беларуска-літоўскія губерні пасля паўстання 1863–1864 гг. з цэнтральных рэгіёнаў Расійскай імперыі [2; 11]. Дадзены від крыніц ўтрымлівае ў сабе ўражанні прадстаўнікоў чынавенства аб насельніцтве, сацыяльных, культурных і эканамічных асаблівасцях рэгіёну; рабоце мясцовых органаў улады, паверачных камісій [3, с. 37]. Дадзеныя ўспаміны з’яўляюцца ў большасці выпадкаў адлюстраваннем пэўнага светапогляду аўтара, грунтуюцца на яго ўласнай памяці і асабістым досведзе.



Рэпазіторый ВГУ

Значны пласт крыніц прадстаўляюсь асабістыя прашэнні і скаргі насельніцтва на дзеянні мясцовай адміністрацыі [напр: 6, арк. 16, 27; 9, арк. 8–11]. Дадзеныя дакументы маюць вялікую каштоўнасць для даследавання прафблем функцыянавання ўстаноў па сялянскіх справах, бо менавіта яны павінны былі разглядаць скаргі і рэагаваць на іх. Дадзеныя дакументы дазваляюць уявіць асяродак жыцця і асноўныя патрэбы розных катэгрый насельніцтва. Скаргі праліваюць святло на ўзаемаадносіны паміж рознымі саслоўнымі групамі; адлюстроўваюць успрыманне насельніцтвам дзеянняў мясцовай адміністрацыі ўсіх узроўняў – ад валаснoй да губернскай; даюць магчымасць прасачыць дынаміку зрухаў у юрыдычнай падкаванасці і ўспрыманні ўласных грамадзянскіх і эканамічных правоў насельніцтвам. Скаргі нясуць адбітак светаўспрымання асобы, якая пісала скаргу, таму акрамя іншага, іх аналіз дае каштоўныя звесткі па гісторыі штодзённасці.

Пры даследаванні сацыяльна-эканамічных пытанняў развіцця беларуска-літоўскіх губерняў варта вылучыць ***перыядычныя выданні***. Такое вылучэнне мае даволі ўмоўны характар, бо ў гэтай групе змяшчаюцца матэрыялы рознага зместу: ад заканадаўчых і справаздачных да публіцыстычных. Дадзеныя крыніцы ўтрымліваюць багаты матэрыял па рэгіянальнай гісторыі і адлюстроўваюць вынікі дзейнасці мясцовых па сялянскіх справах устаноў. Аднак частам дзейнасць устаноў па сялянскіх справах ацэньвалася ў залежнасці ад палітычных поглядаў і прыхільнасцей аўтараў артыкулаў у перыядычных выданнях. Аналіз публіцыстычных крыніц даў магчымасць зрабіць выснову пра ўспрыманне рэформы і новай сістэмы мясцовага кіравання сучаснікамі падзей.

Такім чынам, крыніцы дазваляюць прасачыць эвалюцыю змяненняў органаў мясцовай улады ў вёсцы, канструяваць іх дзейнасць і ўстанавіць характар узаемаадносін паміж усімі элементамі сістэмы кіравання вёскай, прасачыць стасункі з органамі сялянскага самакіравання, з удзельнікамі аграрных адносін – сялянамі і памешчыкамі, а таксама выявіць выніковасць дзейнасці ўстаноў па сялянскіх справах.


1. Долгач, Т. В. Деятельность Губернских по крестьянским делам присутствий по реализации крестьянской реформы (1861–1903 гг.) / Т. В. Долгач // Научные труды Республиканского института Высшей школы. Исторические и психологические науки: в 3 ч., ч. 1, вып. 18 / пред. редкол. В.А. Гайсенок. – Минск : РИВШ, 2018. – С. 100–108.
2. Захарьин, И. Н. Воспоминания о службе в Белоруссии 1864–1870 (Из записок мирового посредника) / И. Н. Захарьин // Исторический вестник. – 1884. – № 3. – С. 538–565.
3. Луговцова, С. Л. Крестьянская реформа в Беларуси в воспоминаниях мировых посредников / С. Л. Луговцова // Крыніязнаўства і спецыяльныя гістарычныя дысцыпліны: навук.зб. Вып. 7 / рэдкал.: С. М. Ходзін (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БДУ, 2012. – С. 37–48.
4. Местное Положение о поземельном устройстве крестьян, водворенных на помещичьих землях, в губерниях: Виленской, Гродненской, Ковенской, Минской и части Витебской // Крестьянская реформа в России. Сборник законодательных актов. – М. : Госюриздат, 1954. – С. 341–390.
5. Местное положение о поземельном устройстве крестьян, водворенных на помещичьих землях в губерниях: Великороссийских, Новороссийских и Белорусских // Крестьянская реформа в России. Сборник законодательных актов. – М. : Госюриздат, 1954. – С. 179–242.
6. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей – НГАБ). – Ф. 242. Воп. 1. Спр. 1.
7. НГАБ. – Ф. 242. Воп. 1. Спр. 2.
8. НГАБ. – Ф. 242. Воп. 1. Спр. 67.
9. НГАБ. – Ф. 242. Воп. 1. Спр. 68.
10. Общее положение о крестьянах, вышедших из крепостной зависимости // Крестьянская реформа в России. Сборник законодательных актов. – М. : Госюриздат, 1954. – С. 37–80.
11. Песковский, М. На рубеже двух эпох / М. Песковский // Русская старина. – 1896. – № 3. – С. 511–533; № 4. – С. 57–78.
12. Положение о губернских и уездных по крестьянским делам учреждениях // Крестьянская реформа в России. Сборник законодательных актов. – М. : Госюриздат, 1954. – С. 135–158.


Репозиторий ВГУ